**Галіна Брага**



**Бібліёграф
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі**

# З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

У культурнай спадчыне кожнага народа кніга заўсёды займала адметнае месца. Ва ўсе часы яна была і застаецца крыніцай ведаў, сродкам асветы, выхавання, пазнання навакольнага свету, сувяззю паміж мінулым і сучасным. Галоўным дасягненнем эпохі Адраджэння стала з]яўленне друкаванай кнігі, якая паўплывала на нацыянальную свядомасць народаў, адкрыла новую старонку ў развіцці адукацыі, літаратурнай мовы, мастацтва, далучыла да скарбаў сусветнай цывілізацыі і культуры.

Пісьменнасць на беларускіх землях узнікла прыкладна ў X ст. Самым старажытным помнікам лічыцца надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава (X ст.), больш познім – Барысавы камяні (XII ст.). Асноўным сродкам фіксавання і распаўсюджвання інфармацыі да вынаходніцтва кнігадрукавання былі рукапісныя кнігі. На тэрыторыі Беларусі яны з’явіліся ў X ст. разам з хрысціянствам і ствараліся пры манастырах і цэрквах, а пазней пры княжацкіх дварах. Найбольш вядомыя рукапісныя кнігі, знойдзенныя на беларускіх землях, – Супрасльскі рукапіс і Тураўскае Евангелле (XI ст.), Полацкае Евангелле (другая палова XII – пачатак XIII ст.). Кніжная рукапісная культура дасягнула росквіту ў час дзейнасці вядомых асветнікаў XII ст. Е. Полацкай і К. Тураўскага. Шырокае распаўсюджванне атрымала ў другой палове XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ), калі беларуская мова стала дзяржаўнай.

На працягу многіх гадоў людзі шукалі спосабы друкавання кніг. Самым раннім метадам механічнага ўзнаўлення тэксту і ілюстрацый стала ксілаграфія – атрыманне адбіткаў з цэльнай гравіраванай драўлянай формы. Вынаходнікам кнігадрукавання з дапамогай наборнага шрыфту ў Еўропе стаў нямецкі друкар І. Гутэнберг, які ў 1457 г. разам з П. Шоферам выдаў у Майнцы Псалтыр, дзе ўпершыню з’явіліся шматколерныя адбіткі. У хуткім часе кнігі сталі выдаваць у Італіі, Швейцарыі, Францыі, Венгрыі, Іспаніі, Англіі і іншых краінах. Славянскае кнігадрукаванне ўпершыню з’явілася ў Чэхіі. Кнігадрукаванне кірылічным шрыфтам пачалося ў Кракаве ў 1491 г., калі Ш. Фіёль выдаў Актоіх і Часаслоў. У канцы XV ст. друкарні існавалі

ўжо ў 260 гарадах Еўропы, дзе было выдадзена каля 40 тыс. кніг агульным тыражом больш за 10 млн экз.

З'яўленне друкаванай кнігі ў першай чвэрці XVI ст. на ўсходнеславянскіх землях звязана з дзейнасцю славутага палачаніна, асветніка-гуманіста Ф. Скарыны, які 6 жніўня 1517 г. выдаў у Празе Псалтыр – сваю першую кнігу на царкоўнаславянскай мове ў беларускай рэдакцыі.

Дзякуючы шырокім гандлёвым, культурным і палітычным сувязям, з канца XV ст. еўрапейскія друкаваныя выданні былі вядомы і на беларускіх землях. Іх завозілі з Польшчы, Усходняй Прусіі, Маскоўскай Русі, Украіны. У кнігах мелі патрэбу феадалы, кіруючыя колы, духавенства, гарадское насельніцтва. Неабходнасць стварэння ў сталіцы ВКЛ друкарні ўсведамлялі ўжо ў першай чвэрці XVI ст. Яшчэ да прыняцця Першага Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г., на Віленскім сейме 6 снежня 1522 г. вялікі князь ВКЛ і кароль польскі Жыгімонт I Стары абяцаў выдаць яго бітымі літарамі. Рэалізаваць гэта не ўдалося, аднак першая друкарня ў Вільні была створана менавіта ў гэтым годзе. Яе заснавальнікам стаў Ф. Скарына, які адным з першых зразумеў вялікую гістарычную ролю друкаванай кнігі як крыніцы ведаў і асветы, сродку культурнага і навуковага прагрэсу. У другой палове XVI ст. у сувязі з развіццём феадальных і грамадскіх адносін, пашырэннем Рэфармацыі і абвастрэннем царкоўна-рэлігійнай барацьбы, рэалізацыяй палітычных планаў, у тым ліку уніі з Польшчай, попыт на кнігі ў ВКЛ рэзка павялічыўся. У гэты час кнігадрукаванне развівалася дзякуючы дзейнасці некаторых прыватных, пратэстанцкіх, а таксама праваслаўных друкарняў, што існавалі не толькі ў сталіцы княства і буйных гарадах, але і ў прыватных маёнтках, пры манастырах. З XVII ст. інтэнсіўнае развіццё атрымала ўніяцкае кнігадрукаванне, пашырылася таксама выданне кніг лацінскім шрыфтам. У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі з'явіліся выдавецтвы, якія мелі рысы дзяржаўных прадпрыемстваў – Магілёўская прыдворная і Гродзенская каралеўская друкарні. Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) і далучэння беларускіх зямель да Расійскай Імперыі ў айчынным кнігадрукаванні ў канцы XVIII ст. вызначыўся новы напрамак – выданне кірылічных кніг грамадзянскага шрыфту. Яны выходзілі ў мясцовых друкарнях у Вільні, Гродне, Полацку, Магілёве.

Асаблівасцю беларускага кнігадрукавання ў XVI–XVIII стст. быў шматмоўны і шматканфесійны характар. Выпускаліся кнігі на старабеларускай, царкоўнаславянскай, польскай, лацінскай, французскай, нямецкай і іншых мовах кірылічным і лацінскім шрыфтамі. Яны адлюстроўвалі ўсе бакі жыцця беларускага народа, аказвалі значны ўплыў на станаўленне і развіццё нацыянальнай культуры, вызначаліся выключнай разнастайнасцю – тэматычнай і жанравай. Друкаваліся выданні Бібліі, тэалагічная і палемічная літаратура, кнігі па гісторыі, статуты ВКЛ, канстытуцыі сеймаў, зборнікі прававых актаў і творы выдатных дзеячаў еўрапейскага Адраджэння, пераклады сучасных і старажытных аўтараў, навуковая і вучэбная літаратура і інш. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) захоўваецца самы вялікі ў нашай краіне збор беларускіх стададрукаваных выданняў, выпушчаных у XVI–XVIII стст. Яны з'яўляюцца яркім сведчаннем высокага развіцця айчыннай культуры і каштоўнай крыніцай для даследавання нашага мінулага.

У 2017 г. у Беларусі і многіх краінах свету адзначаецца знамянальная дата – 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання (уключана ў каляндар знамянальных і памятных дат ЮНЕСКА). Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання распрацаваў комплексную праграму розных юбілейных мерапрыемстваў: адбудуцца міжнародныя выстаўкі, круглыя сталы, навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, фестывалі, прэзентацыі і інш. НББ рыхтуе міжнародны кангрэс «500 год беларускага кнігадрукавання», міжнародны выставачны праект «Францыск Скарына і яго эпоха». У 2017 г. будзе завершаны міжнародны навуковы і выдавецкі праект «Кніжная спадчына Францыска Скарыны». Яго асновай з'яўляюцца электронныя копіі кніг першадрукара, што захоўваюцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны і іншых краін. Факсімільнае ўзнаўленне выданняў Ф. Скарыны, падрыхтаванае НББ сумесна з Белзнешэканомбанкам, з максімальнай паўнатой адлюстроўвае ўсе асаблівасці арыгіналаў. Для лепшага разумення сутнасці і значэння спадчыны Скарыны кожная кніга суправаджаецца навуковым каментарыем, а таксама перакладам прадмовы і пасляслоўя на беларускай, рускай і англійскай мовах.

З выхаду першай беларускай кнігі прайшло пяць стагоддзяў. Змяніліся форма выданняў, іх знешні выгляд, з'явіліся электронныя варыянты. І толькі сутнасць кнігі як носьбіта інфармацыі засталася нязменнай. Паслядоўнікі Ф. Скарыны высока ўзнялі кніжную справу Беларусі – сёння кнігадрукаванне нашай краіны дасягнула значных поспехаў. Беларускую кнігу ведаюць у свеце. Традыцыйным стаў удзел айчынных выдаўцоў на міжнародных кніжных кірмашах, якія праходзяць у Маскве, Варшаве, Франкфурце. Узровень беларускага кнігавыдання дазволіў заснаваць Мінскі міжнародны штогадовы кніжны кірмаш. Сталіца Беларусі ўпэўнена імкнецца да набыцця статусу кніжнай сталіцы, а нашчадкі Ф. Скарыны плённай працай сцвярджаюць свае права быць прадаўжальнікамі духоўнага подзвігу вялікага славянскага першадрукара.

ЛІТАРАТУРА

1. **Бярозкіна, Н. Ю.** Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. і бібл. спец. ВНУ / Н. Ю. Бярозкіна. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 199 с.

2. **Гісторыя** беларускай кнігі. У 2 т. / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. – 423 с.

3. **Кнігадрукаванне** // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : [у 3 т.]. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 112–114.

4. **Кніжная** спадчына Беларусі [Выяўленчы матэрыял] : з фондаў Нац. б-кі Беларусі. – Мінск : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014. – 411 с.

5. **Кніжная** спадчына Беларусі XI–XVIII стст. : дакументальныя помнікі як крыніцы даследавання гісторыі і культуры Беларусі // Матэрыялы XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.». – Мінск, 2015. – С. 115–240.

6. **Ластоўскі, В.** Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / Вацлаў Ластоўскі. – Факсім. выд. – Мінск : Маст. літаратура, 2012. – 29, VIII, 776 с.

7. **Матэрыялы** другіх кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Рэчы Паспалітай» (Мінск, 15–16 верас. 2000 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; [склад. Т. І. Рошчына ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна (гал. рэд. і інш.)]. – Мінск : Красіка-прынт, 2002. – 271 с.

8. **Міганъ, К.** Пачатак друкаванай кнігі на славянскіх мовах (праект параўнальнага падыходу) / Кшыштаф Мігань // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. прац. – Мінск, 2014. – Вып. 5 : Слова. Мова. Тэкст. Духоўны патэнцыял кніжнай культуры. – С. 20–33.

9. **Мотульский, Р. С.** Из прошлого в будущее. Библиотеки Беларуси : в 2 ч. / Р. С. Мотульский. – Минск : Бел. Энцикл. им. П. Бровки, 2011. – Ч. 1: IX – начало XX в. – 256 с.

10. **Шматаў, В. Ф.** Мастацтва беларускіх стададрукаў XVI–XVIII стст. / В. Ф. Шматаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 129 с.

**Summary**

The article describes a brief history of Belarusian book printing.